**Т. М. Ігнацюк**
Брэст, Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт

## МЕТАДАЛОГІЯ ДАСЛЕДАВАННЯ ПАФАСУ МАЎЛЕННЯ

Сярод усеагульных метадаў пазнання найбольш старажытнымі з'яўляюцца *дыялектычны* і *метафізічны* метады. Уласна метадам з'яўляецца толькі дыялектычны. Метафізіка не метадалагічна, але *металагічна*, аб выкарыстанні метаду ў метафізіцы можна гаварыць з пэўнай доляй умоўнасці: так званы *метафізічны* метад.

Метафізіка ў розныя часы гісторыі перажывала ганенні (паляванне на ведзьмаў, барацьба з ерэтыкамі і да т. п.); таксама яна цярпела прэсінг з боку пануючых класаў. У новы час, па сутнасці, нічога не змянілася. Яшчэ не зышлі ў нябыт часы страху перад метафізікай і так званы "класавы падыход" да яе з боку пралетарскай ідэалогіі. У кантэксце марксісцка-ленінскіх прац слова *метафізіка* ўжывалася як сінонім абману і папоўшчыны, трактавалася як "заіграванне з божанькай", як "метафізічнае трызненне" (У. Ленін). Усё звязанае з метафізікай падводзілася пад катэгорыю буржуазнага. На яе паслядоўнікаў вешаліся ярлыкі "ворагаў народа", яны кляйміліся таксама ідыёмамі тыпу "вашывыя блохі".

Між тым, несумненна, даўно настала пара рэабілітаваць у мовазнаўстве (і не толькі) феномен метафізічнага. Гэта стане вяртаннем да ўсяго, што праходзіць пад лагатыпам "мета" і ўтварае антытэзу традыцыйнай лінгвістыцы.

"Раскоша чалавечых зносін", абсалютна недаступная лінгвістыцы ў варыянце Ф. дэ Сасюра, ажывае ў метавобласці штодзённага – канкрэтна знаёмага і несумненна відавочнага жыццёвага вопыту. Ён фенаменальны і аўтэнтычны. Металагічным называецца ўсё, што выходзіць за межы фармальна-артадаксальнай логікі – ажыццяўляецца насуперак ёй і не паддаецца лагічнаму тлумачэнню. Гэтая "замежнасць" успрымаецца парадаксальна – як незвычайнае і нечаканае.

Па сутнасці, кожнае слова штодзённай мовы ў назве канкрэтнай рэчы аказваецца рэлевантным для сэнсоўных "раскопак" у вобласці моўнай *археалогіі*. Напрыклад, бел. *парасон* (ад фр. *parasol* 'заслона ад сонца') арыентуе нас на метафізіку "заслоны" (рус. *занавес*, пол. *kurtyna)* – усяго, што знаходзіцца за ёй і нябачна для гледача. Жыццёвыя сцэны набліжаюцца да гледача, калі гэтая заслона адвешваецца. А праз рус. *зонтик* (ад нідэрл. *zonnedoek*, *zondek* 'тент, навес'), які нагадвае складанае і рухомае покрыва (руск. кров) чалавека пад адкрытым небам, праглядвае метафізіка "покрыва" – усяго, *што акрамя* і лёгка ўладжваецца з дапамогай гэтай рэчы (паводле Л. Долінай). А ў больш шырокім сэнсе – метафізіка чалавечага абавязку (з *обвѧзати*).

Гнасеалогія (літаральна пазнанне 'наскрозь') напамінае рэнтгенаскапію – *прасвечванне*, якое дае магчымасць візуалізаваць нябачнае. Але *прасвет* – гэта і "светлая паласа жыцця", і "шчасце ў звычайна бязрадасным жыцці" [4, т. 4, с. 363]; а *прасвятленне* – "наступленне спакою, радасці, шчасця" [4, т. 4, с. 362]. Усё светлае супадае з праўдай жыцця: *сапраўднае* шчасце, *сапраўднае* пачуццё, *сапраўднае* каханне і г. д. Яно далёка не тоеснае таму, што існуе *на самай справе*, г. зн. існаму. Светлае спасцігаецца ў антытэзе свайму антыподу – *яснаму*. Сапраўдны свет ніхто не павінен несці: ён сам даходзіць ці губляецца на сваім шляху. Менавіта з гэтай прычыны існуюць выразы *халера ясна*; *справа ясная, што справа цёмная.* Выраз "*Усё ясна"* – эпагей спекулятыўнасці. Ні ясны свет, ні справа светлымі не бываюць – яны свецяць адлюстраваным (адбітым) светам, не здольным высвеціць сапраўдную сутнасць рэчаў. Метафізіка неадлюстраванага свету, як і ўсяго, што разглядаецца *ў свеце* і *ў сілу* чагосьці (а не з прычыны нечага), неўзараны цалік металінгвістыкі.

Пазнанне як прасвятленне (насуперак анталогіі разумення) само па сабе метафізічна: "Метафізікай я называю гнасеалогію таму, што яна зыходзіць з супрацьстаяння суб'екта і аб'екта, з рэчыўнага расколу ведаў і быцця, з'яўляецца або свядомым, або несвядомым веравучэннем, а не фактычнай рэчаіснасцю" [3, с. 44–45].

Метафізіка для чалавека ёсць некаторая канкрэтная і рэальная прысутнасць, якая стаіць за бачнымі з'явамі і фактамі (мета 'выхад за межы') [1, с. 262]. Метафізічны, напрыклад, увасоблены ў тэксце сэнс. Без чалавека гэта ўсяго ліст паперы з незнаёмымі "завітушкамі". Аднак за тэкстам стаіць сэнс, закладзены сюды аўтарам. Кожны чытач разам з аўтарам працягвае

тварыць сэнсавае поле тэксту. І гэта не ёсць звыклае супрацоўніцтва і суґалоссе, гэта паразоў творчых індывідуальнасцей, у якім кожны пакідае сваю "метку".

Фізічныя органы пачуццяў ні сэнс, ні яго стваральніка-аўтара не ўспрымаюць. Сэнс не ўпісаны арганічна, а ўцеляснёны ("ушчымлены") у тэкст. Яго нельга бачыць, аднак граматны чалавек не сумняваецца, што ён, як і яго аўтар, *ёсць-прысутнічае*. Гэты сэнс і канкрэтны аўтар складаюць метафізічную рэальнасць спісанага ліста паперы.

Метафізічнае не месціцца "дзесьці там". Яно знаходзіцца ў непасрэднай блізкасці да чалавека і ўспрымаецца ім у сваёй адвочнасці як верагоднае. Яно перажываецца чалавекам, з ім ён зазнае пакуты творчасці. Свет душы другога чалавека – самая што ні ёсць метафізічна нябачная іншым рэальнасць-"прыцемак", у якой важна знайсці прасветы, якія набліжаюць для нас сапраўднае. Феномен бліжняга і свайго-чужога спасцігаецца праз метафізіку – метавобласць ўвасаблення *этасу* другога чалавека.

Паспрабуем адысці ад інстанцыі бліжняга і звярнуцца да таго, чаму яно стварае антытэзу. Такі зварот прыводзіць да даследавання пазітыўнасці (праяўленасці). Сустрэчу з непраяўленым, але ўвасобленым у слове, г. зн. з мудраслоўнымі ўвасабленнямі сутнасці як *пачатку* ўсяго інтэнцыянальнага – упэўненасцей чалавека, цудоўнага, непадзельнага і г. д. – даследчыку пафасу даводзіцца адкласці. Пафас не арыентаваны на "ход", але акрэслена накіраваны на выніковасць – тое, што было *потым*. У праяўленні самасці ("крутасці") і ў прадстаўленні пэўным ("такім") вобразам роднага, якое ўсведамляецца як закон існага, прэзентуецца і рэпрэзентуе адзначаны рытарычны складальнік.

Згодна з акрэсленай устаноўкай, цікавасць даследчыка пафасу маўлення павінна факусіравацца на *звычайным*, а інтарэсу падлягаць надзвычайныя, г. зн. шматлікія краёвыя звычаі і *інстытут* адзінага (родавага) *Закону*. Не адракаючыся ад метафізікі цудоўнага, мы пераходзім у сферу рэчаіснасці, якая не творыцца, а канструіруецца людзьмі. Такая рэчаіснасць для чалавека не свая. Яна прыцягвае і здзіўляе, ці, наадварот, асоба адварочваецца ад яе і ганьбіць яе. У такой рэчаіснасці праяўляецца неабходнае імкненне быць першым і свабодным. Даследаванню *інстытуцыянальнай рэчаіснасці* і адпавядае *дыялектычны метад*.

Дыялектыка абапіраецца на ўніверсальныя аперацыі і механізмы дабывання ведаў – параўнанні (прапорцыі) і супастаўленні. Яны не падыходзяць да *ўсяго*, а ўспрымаюцца ў некаторай цэласнасці. Апошняе мае лінейны характар: не цягнецца, а кожную хвіліну доўжыцца і прадаўжаецца. Напрыклад, у этычным перажыванні "Ты для мяне *ўсе*" за "ўсім" стаіць рэфлексія: *свет маіх вачэй*, *шчасце маё*, *радасць мая*, *гора* маё і г. д. Гэтае "ўсё" спантанна эвалюцыянуе (точыцца), расце і парываецца ў вышыню. У яго ёсць усеабдымная назва – *Жыццё*, у цэласным перажыванні якога дыялектыцы няма месца.

Дыялектычны метад з'яўляецца пазітыўным – дапускае аперацыю параўнання з'явы з раней ужо дадзенай. Ён таксама канструктыўны: механічна ставіць адзін прадмет побач з другім, катэгарызуючы іх. Але гэты метад не падыходзіць да ўсяго, што пазбягае прапорцыі і супастаўлення, але пазнаецца праз "не". Яно безымяннае, аднак у яго ёсць шмат назваў: "непаўторнае", "незвычайнае", "небывалае", "немажлівае", "нечаканае" і г. д. – адным словам, *цудоўнае*. Яно не даказваецца як існуючае, аднак з пэўнасцю *ёсць* і аксіяматычна *прысутнічае*.

Наадварот, у даследаванні існага і дзейснага – таго, што бытуе і неяк пазіцыяніруе сябе, – дыялектычны метад з'яўляецца найбольш адэкватным і адпавядае прадмету аналізу. Станоўчы бок дыялектыкі бачыцца ў тым, што яна разглядае з'яву гістарычна, г. зн. у развіцці. Дыялектычны метад дазваляе прасачыць *ізамарфізм* з'явы – розныя ўзроўні развіцця аднаго і таго ж. Гісторыя паўтараецца, але ўжо на іншым узроўні.

Гістарычны падыход адкрывае перспектыву даследавання непераемнай па сутнасці "патомнасці". У гэтай перспектыве актуальнымі з'яўляюцца пытанні не толькі "Чый?", "З якога роду?", але і пытанне "Адкуль?": *Адкуль жа вы, хлопцы, чые? Няўжо з беларускага краю? Радзіму я годнаю знаю, і добрыя людзі яе* (П. Місько). З адзначанымі пытаннямі звязваецца функцыя маркера і роля імені. Гісторыя таксама развіваецца па прынцыпу выбарнасці. Супрацьпастаўленне абранага калектыву неабранаму ("*Мы – не мы*") – асобны момант даследавання пафасу. Гістарычны падыход адкрывае магчымасць даследаваць семантыку поля культуры і камунікатыўную прастору ідэалогіі пануючага класа. Ім спадарожнічае адпаведная прагматыка маўлення.

Абмежаванасць гістарычнага падыходу ў тым, што, даследуючы гістарычнае мінулае, ён ўпускае з поля зроку архаічнае м і н у л а е – усё, што не паўтараецца, а *пераймаецца*. Адна справа задаць сабе пытанне "*Што яно напамінае?*" і цалкам другое заўважыць "*На што гэта падобна?*". Першае спасылаецца на памяць, якая захоўвае пэўныя факты і падзеі: "*Таго, што не стала ўспамінам, не было*" (Я. Брыль). Другое – "*не помніць роднасці*", але заўважае ўсё, што праходзіць і мінае. З падобнага бяспамяцтва ўзнікае патрэба запісваць, імкнучыся наблізіць яго да ўсіх, хто пры гэтым не прысутнічаў. Намінацыя фактаў і падзей захоўвае іх людзям, але не ратуе іх "жыцця" для гледачоў і слухачоў. У адрозненне ад былога, мінулае не застаецца ў памяці, яно індэксуецца і вербалізуецца на паперы ў выглядзе тэксту.

Гістарычнае развіццё разумеецца як пераход ад аднаго да другога. Напрыклад, быў вучням (школа), студэнтам (інстытут), аспірантам (аспірантура), дактарантам (дактарантура) і г. д. Адбываецца пераход ад адной установы (інстытуцыі) да другой. Такога "трансферу" няма ў станаўленні; тут ёсць жыццёвы шлях, які нехта *праходзіць*: *хлопчык – мужчына – бацька* і да т. п. На ім – ступені і інстанцыі, кожная з якіх не адмаўляе папярэднюю.

З праходжаннем ступеняў-інстанцый звязаны рост *чаго-каго*. Інстанцыя росту знаходзіцца па-за межамі дыялектыкі, напрыклад: *вырасці на вачах, вырасці да неба, вырасці ў чыіх вачах* і г. д. Гісторыя ведае перыяды і "вехі", аднак гістарычнае развіццё не градуіраванае.

Структурны прынцып паўстае як спосаб арганізацыі. Неарганізаваная супольнасць прадстаўляецца суцэльнай масай, якой супрацьпастаўляе сябе эліта. У любой гісторыі грамадства заўсёды было рухомым адзінства меншасці і масы. Меншасць (напрыклад, партыя) – сукупнасць асоб, якія выдзяляюць і пазіцыянуюць сябе арганізацыйна. Маса асацыіруецца з пасрэднасцю. Сярэднестатыстычны чалавек не адрозніваецца ад астатніх і паўтарае агульны тып (прынцып "*Усе вы такія*").

Арганізацыйныя прынцыпы разыходзяцца з мадэлямі ўпарадкавання і станам, калі "*Усё ў парадку*". Парадак – залог стабільнасці і спакою, якому з неабходнасцю спадарожнічае трывога і апасенне: "*Абы ціха, абы вайны не было*" (з народнага).

Адна справа – камунікатыўная трансакцыя па дзеяслове *сказаць* і цалкам іншае – *гаварыць*. Размова *ёсць* (*Ёсць размова* ці *Няма мовы*). Маналагічнасць размовы абумоўліваецца тэмай. Суразмоўцы супольна падтрымліваюць размову, не даючы ёй зрабіцца "цяпельцам". У гэтым сутнасць маналагічнасці. Дыялог жа напамінае "зыркае" вогнішча. Для спакойнай гаворкі, наадварот, не ўласцівы адкрыты агонь і прысак. Аднак іменна з гэтымі з'явамі часцей за ўсё асацыіруецца пафас маўлення.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Вышеславцев, Б. П. Этика Преображенного Эроса / Б. П. Вышеславцев. – М. : Республика, 1994. – С. 368.

2. Гадамер, Х.-Г. Истина и метод: Основы филос. Герменевтики : пер. с нем. / Х.-Г. Гадамер ; общ. ред. и вступ. ст. Б. Н. Бессонова. – М. : Прогресс, 1988.– С. 704.

3. Лосев, А. Ф. Бытие Космос Имя / А. Ф. Лосев. – М. : Мысль, 1993. – С. 630.

4. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т. / Акад. навук БССР, Ін-т мовазнаўства ; пад агул. рэд. А. А. Атраховіча (Кандрата Крапівы). – Мінск : БелСЭ, 1977–1984. – 5 т.